№ 9. Ausgabe B.

ГОМАН

Цэна с перэсылкай і дастаукай да хаты: на 1 год—4 м. 80 фэн., на ½ году—2 м. 40 ф., на 3 месяцы—1 м. 20 ф., на 1 мес.—40 фэн.

Беларуская Віленская часопісь
выходзіць два разы у тыдзень: у аўторкі і пятніцы.

Адрэс рэдакції: Вільня, Завальная 7.
Адрэс адміністрації і экспэдыції: М. Стэфанская 23.

Цэна абвестак: на 4-ай старане за радок дробнымі літэрамі—25 фэніг.; дробные абвесткі—па 5 фэн за слова. Абвесткі аб сьмерці—60 фэн. за лінейку дробн. друкам.

№ 9 (101). Год II. Вільня, 30 студня 1917 г. Цэна 5 фэн. (3 кап.).

Пакушэньне на Гішпанскаго караля.

29 студня.

Заходні тэатр:

Фронт Рупрэхта Баварскаго: На поўначы ад Армант'ер, на заходзі ад Фромэль, на поўначы ад Нэўвіль-Ст.-Вааст і на палудзенным берэзі Анкр адбіты опэрації ворагоў.

Фронт нямецкаго Насьледніка: На заходнім берэзі Маасу французы раніцай, без падгатоўкі агнём, і пасьля палудня, с сільнай артылерыйскай падгатоўкай, памыкаліся адабраць назад здабытые намі 25 студня пазыції на вяршыне 304. Ня гледзячы на вялікіе ахвяры людзьмі і ваеннымі матэр'ялямі, французы не ўзялі ў нас ні пядзі зямлі. У Вогезах — удачные патрульные опэрації.

Усходні тэатр:

Фронт Леопольда Баварскаго: На Аа—слабая баевая работа.

На Залатой Ліпе турэцкіе войскі 15-го корпуса адбілі массовые расейскіе штурмы. У часі контратакі ўзяты палонные.

Фронт эрц-герцога Іозэфа: На адрэзку Мэстэканэсті ворагі падтрымлівалі сільны агонь артылерыі. Адбіты дальше расейскіе атакі.

На фронці *Макензэна* і на *Македонскім*—нічога выдатнаго.

Пакушэньне на гішпанскаго Караля.

МАДРЫД (Гавас). Ліхадзеі прабавалі вызваць разбіцьце каралеўскаго поезду каля Грэнады. Арэштавана адна асоба, якая добра гаворыць па француску і па англіцку. Жудуць новых арэштоў.

Міністэр унутрэнных спраў вядзе сябе вельмі скрытна, каб не парашкодзіць сьледству.

Пагібель англіцкаго крэйсэра.

ЛОНДОН. (Офіцыяльна). Крэйсэр «Laurentic», 14,892 тонн, 25 студня затоплен каля берагу Ірляндії нямецкай падводнай лодкай ці мінай. Выратаваны 12 афіцэроў і 109 матросоў.

Уступка Фінляндцам.

КОПЭНГАГА. «Tidende» даносіць з Апаранды, што думка аб агульнай мобілізаціі ў Фінляндіі аткінута, бо расейская глаўная каманда цьвёрда выступіла проці яе.

Спажыуны крызіс у Парыжы.

БЭРН. Недастача каменнаго вугалья ў Парыжы трывае далей. Агульна-работніцкі саюз у адозве сваей да правіцельства, парляманту і грамадзянства жадае станоўчых крокоў дзеля змаганьня з вострай недастачай спажыўных прадуктоў.

Разрухі у Італії.

ЛОНДОН. У розных местох Італії с прычыны недастачы каменнаго вугалья і спажыўных прадуктоў узнімаюцца разрухі.

Катастрофа у Румынії.

ШТОКГОЛЬМ. «Руск. Сл.» даносіць, што румынскі кароль разам са сваім дваром выбраў на мейсцо жыцьця места Кацярынаслаў, у палудзеннай Расеі, дзе ён будзе жыць у палацу Потёмкіна. Правіцельство, парлямэнт і міністэрствы часьцю перэбяруцца таксама ў Кацярынаслаў, часьцю ў Хэрсон.

«День» пішэ, што ўсе банкі з Ясс ужо перанесены на расейскую зямлю.

У Румынії курс рубля устаноўлен на 2,66 леў,—а тым часам ешчэ ў жніўні месяцу за рубель давалі 1,45 леў.

ЖЭНЕВА. Румынскі начальнік генэральнаго штабу, генэрал Ільеску, прыехаў у Парыж. Ен вёў перэгаворы с французскім ваенным міністрам і з Брïанам. Перад абедам адбылася незвычайная ваенная нарада, на якой быў глаўнакамандуючый на нямецкім фронці, генэрал Нівэль.

Грэцкая трагедія.

ЛЮГАНО. Грэцкіе ўласьці звярнуліся да пасла Злучэных Штатоў у Афінах с цьвёрдай просьбай дабіцца таго, каб назначэные для Грэції параходы з амэрыканскім збожжэм былі дапушчэны ў Пірэйскі порт. Калі блокада і будзе зьнята, дык недахватка хлеба будзе трываць яшчэ некалькі дзён.

Італьянская колонія паслала свайму міністру-прэзыдэнту тэлеграму, кажучы: „Мы — сьведкі і учасьнікі нячутых мук грэцкаго народу“.

АФІНЫ. (Гавас) 29.І. Міністэр заграпічных спраў паведаміў у суботу францускаго пасла, што генэрал Калярыс, згодне з жаданьнем саюзьнікоў, утраціў сваю каманду, і што правіцельство ў пятніцу прыступіло да роспуску шкодных паводлуг думкі саюзьнікоў саюзоў запасных.

НА ФРОНТАХ.

Апошніе тыдні сусьветнай вайны на ўсіх фронтах прайшлі даволі спакойна. Наступленьне цэнтральных дзержаў у Румынії прыпынілося.

Гэта тлумачыцца, з аднаго боку, патрэбай даць адпачыць войску, якое цэлые месяцы праводзіло ў гарачых бітвах, а з другога—пастановай расейцоў за ўсялякую цану удзержацца ў Молдавії, заваеваньне каторай грэзілобы ўсяму ваеннаму пляну Расеі. І сусьветная вайна ізноў перэжывае перадышку, якую перэжывала ў прошлым і пазапрошлым гадах. Падобные перадышкі бывалі і ў вялікіх войнах даўно мінулых часоў — як у трыдцацілетняй, сямілетняй, так і ў напалеоноўскіх войнах. Тады яны былі патрэбны затым, што тагочасные дарогі зімою не давалімагчымасьці даволі скора і лёгка падвазіць для арміі усё патрэбнае дзеля вайны. У нашы часы чыгунак і аўтомобілёў гэткіх труднасьцей ужо німа, і перадышка, якую цяпер бачым у сусьветнай вайне, тлумачыцца іншымі—чыста ваенными прычынамі.

Само сабой разумеецца, абмылковай была-бы думка, што апошніе тыдні змарнаваны для ваюючых старон. Наадварот, судзячы паводлуг вестак газэт і з іншых крыніц, саюзьнікі ужылі гэты час дзеля падгатоўкі вялікаго агульнаго наступленьня. Што робіцца з гэтаго боку фронту—мы не ведаем, дый калі-б ведалі, дык аб тым нельга было бы пісаць; але нікому тое не тайна, што і цэнтральные дзержавы напружаюць свае сілы дзеля таго, каб быць гатовымі, як трэба, спаткаць вясну, калі пачнецца бадай найцяжэйшы акт нячутай крывавай трагедії чэлавечэства.

Найвялікшае пытаньне, якое паўне кожын задаець сабе ў гэты момэнт, гэта: што павінно стацца ў найбліжэйшым часі? Саюзьнікі ліпше аткрыта не раз ужо апавешчалі, што вясной пачнецца іх новае наступленьне,—і мы можам зусім гэтаму верыць. З другога боку, нельга сумлевацца, што цэнтральные дзержавы павінны папярэдзіць ворагоў сваім наступленьнем. Аб гэтым кажэ здаровы розум, дый імёны Гіндэнбурга і Людэндорффа, каторые напеўна ня будуць ждаць, каб дзесяць саюзьнікоў, закончыўшы свае прыгатаўленьня, ў адзін момэнт усе разам напалі на Нямеччыну і злучэные з ей дзержавы. І мы думаем, што не выдамо ніякаго, сэкрэту, кажучы, што цэнтральные дзержавы пастараюцца пачаць сваё наступленьне перш за сваіх ворагоў.

Пытаньне, на каторае цяжэй або і зусім нельга атказаць, гэта будзе: а дзе-ж пачнецца тое наступленьне, ад катораго будзе залежаць развязка вайны? Калі нідаўна адзін амэрыканскі журналіст запытаўся аб гэта ў Гіндэнбурга, той насьмешліва атказаў „мо' на Усходзі, а мо' і на Заходзі, — невядома!“ Атказ Гіндэнбурга, папраўдзі, пералічыў усе магчымасьці. Палудзенна-ўсходні (балканскі) фронт пасьля разгрому Румынії утраціў сваю незалежнасць і стаўся толькі часткай Усходняго. С палудзенна-заходнім (італьянскім) фронтам сталося нешта падобнае: пасьля пастановы паслаць туды часць францускіх сіл, ён абярнуўся ў палудзеннае крыло заходняго фронту. А аб Салоніцкім фронці пасьля румынскай катастрофы німа што і казаць: ён утраціў уселякую вагу.

Нямногіе тыдні, а мо' і нямногіе дні аддзеляюць нас гэтак ад пачатку ваенных прыпадкоў, ад каторых залежыць лёс сусьветнай вайны і перад каторымі пабледнеюць усе ранейшие здарэньня на ваенных тэатрах, нават самые вялікіе і самые сур'ёзные. Здарэньнеў гэтых адны ждуць са страхам, другіе — з надзеяй, але кожын, у каго б'ецца жаласьлівае сэрцэ, с шорахам думае аб нялічэных крывавых ахвярах, якіх яны будуць вымагаць, — ахвярах ешчэ вялікшых, чым тые, якіе забрала аграмадная баталія на Сомме.

З дакумэнтоў мінуўшчыны.

Мы атрымалі незнаны дагэтуль дакумэнт, каторы кідае цікавае сьветло на адносіны між Польшчай і Беларуска-Літоўскім Краем, званым калісь Літвой. Дакумэнт гэты адносіцца да часу паўстаньня 1831 году, калі — разам с Польшчай—і наша Бацькаўшчына прабавала кроў сваю за вызваленьне с-пад расейскаго ярма. Вось перэклад яго с польскай мовы:

Маршалак Нацыональнаго Ураду ў Радзе міністроў.

Стоючы при рулю Нацыональнаго Ураду, я лічу за сваю мілую павіннасць ад імі Прэдстаўнікоў Польскаго Народу, ад імі Бацькаўшчыны нашай выказаць так слушна належную падзяку Вам, братом Літвіном, за Вашы неаграпічэные ахвяры, ваенны труд і адважные выступленьня дзеля паддзержкі сьвятой справы нашай і уфундаваньня быту Бацькаўшчыны. Літвіны, Вы заслужылі на

ўдзячнасць Народу і на пашану і здзіў цывілізаваных людоў. Хто аддаў сваё меньне, хто гэтулькі разоў без трывогі падстаўляў сваю галаву, хто крывёй хацеў купіць шчасьце Краю і землякоў,— для таго німа нагароды. Вы, Літвіны, за цноты Вашы толькі ў Вашых сэрцах знойдзеце годную аддзяку.

Немоевскі.

Райца, Дзержаўны Сэкрэтар.
М. П.
Закрочым, дня 15 верэсьня 1831 г.

Дакумэнт гэты адрэсован:

„Да Пана Констанціна Графа Тышкевіча, Паручыка Ад'ютанта Генэрала Брыгады Дзеконьскаго".

Мінуло 85 гадоў с таго дня, як быў напісан гэты дакумэнт. І вось унук чэлавека, каторы пісаў яго, першы маршалак новай Дзержаўнай Рады адбудаванай Польшчы, Немоёвскі, ў першай сваей прамові ад імі Польскаго Народу у „аддзяку" Літве апавешчае, што „гістарычная міссія" новаго Польскаго Каралеўства—гэта „пашырэньне граніц" Польшчы на землі нашаго Краю, адваёваные ад Расеі, гэта паняволеньне тых самых „братоў Літвіноў", каторые калісь поруч с палякамі лілі сваю кроў „за нашу і вашу волю"...

У чым наша сіла?

Сіла народу—ня ў тым, каб у ім была жменя багатых людзей, каторые маглі-бы кінуць на грамадзкіе патрэбы гэтулькі то тысяч ды за іх наладзіць тые ці іншые установы. Сіла народу — ў тым, каб гэткіе установы паддзержывалі-бы шырокіе кругі грамадзянства, каб з дробных, капеечных, але чысьленых і пастаянных ахвяр і складак грамадзянство магло-бы здаволіваць свае культурные патрэбы.

Калі чэскі народ пачаў будзіцца да самабытнаго культурна-нацыональнаго жыцьця, ён даў яркі доказ сваей сілы. Даволі сказаць, што з дробных грашовых ахвяр чэхі пазакладалі сабе скрозь школы ў роднай мове, а ў сваім сталічным месьці, Празе, пабудавалі вялізны гмах чэскаго тэатру, на якім напісалі: „народ сам сабе". Гэтак жэ паўставалі чысьленые чэскіе коопэратывы, якіе становяць адну з асноў дабрабыту чэскаго селянства.

І гэта зусім зразумела. Там, дзе ёсць нацыональна і грамадзка сьведомые народные массы, — там у народзі ёсць пастаянная і бяздонная крыніца матэр'яльных засобоў: народ неустанна творыць багацьце свайго Краю і гэтак-жэ неустанна нават найдрабнейшымі ахвярамі можэ забаспечываць быт патрэбных яму грамадзкіх установ.

Мы, тут у Вільні, былі сьведкамі аднэй спробы збудаваць для тутэйшаго польскаго грамадзянства пастаянны польскі тэатр. Калі ўрэшці — праз пару гадоў пасьля рэвалюціі—счэзла забарона „інородцам" іграць на сцэне ў роднай мові, ў Вільню прыехала адна заможная польская артыстка і і, не шкадуючы ніякіх затрат грашмі, залажыла тут сур'ёзны, добра пастаўлены польскі тэатр. Але аказалося, што для шырокіх масс насяленьня Вільні *польскі* тэатр нічога не гаварыў,—і народ не адгукнуўся на яго, не паддзержаў яго. Тэатр збанкрутаваў. І хаця праз цэлы рад далейшых гадоў мы бачылі ўсё новые і новые спробы ладзіць тут сур'ёзную польскую сцэну, — спробы гэтые ўсе разбіваліся вельмі скора аб халодны прыём шырокіх масс, дый самы тэатр апускаўся ўсё ніжэй і ніжэй, раўнуючы да артыстычнай вышыні першаго, ажно дайшло да таго, што віленскае польскае грамадзянство,—здаецца, найбольш сільнае матэр'яльна,—здаволіваецца выступленьнямі раз у тыдзень напалавіну аматорскай сцэны...

Кожнаму вядома, што у беларусоў—асабліва ў межах занятых немцамі зямель — зусім німа заможнаго грамадзянства. Беларусы—гэта ўсё народ рабочы, селяне, рамесьнікі, дробные таргоўцы,—а іх нячысьленая інтэлігенція складаецца з людзей, якіе гэтак сама вядуць напалавіну галоднае жыцьцё, ня маючы доступу да „хлебных" мейсц, занятых другімі. А тым часам нават у гэты найцяжэйшы ваенны час у тым жэ Вільні творацца—праўда, вельмі скромные, але ўсё новые і новые беларускіе культурные установы. Інтэлігенція наша аддае гэтай справе ўсе свае творчые сілы; з другога боку, беларускі працоўны народ, беларускае дробнае мешчанство, каторае баіцца ешчэ нават прызнацца офіцыальна да беларушчыны (ў часі спісоў і т. п.),—яны нясуць свае капейкі і ў беларускі тэатр, які толькі пачынае тварыцца, і ў іншые нацыональные установы, якіе ставяць свай мэтай абслужываць культурные патрэбы свайго грамадзянства. І напаўняюцца дзяцьмі нашы школы—ня гледзячы на „конкурэнцію" іншых школ, ня гледзячы на самую шырокую агітацію нашых ворагоў проці беларускіх школ; збіраецца ўсё болей маладзёжы на беларускіх вучыцельскіх курсах, дзе падгатаўляюцца культурные работнікі і сяўцы нацыональнай сьведомасьці ў нашых вёсках.

Праўда, ўсюды мы бачым ешчэ толькі пачаткі работы, ешчэ ня ўвесь многамільённы народ беларускі ўскалыхнуўся, ня ўвесь зразумеў, што настаў і для яго час з гордасьцю вымаўляць сваё імя і жыць паводлуг сваей уласнай волі. Але тое, што цяпер робіцца, ўжо знайшло грунт у шырокіх народных масcах, і ў гэтым сіла, ў гэтым моц, ў гэтым будучына многамільённаго беларускаго народу.

І. Мелешка.

У Вільні і ваколіцах.

Беларускіе Вучыцельскіе Курсы ў Вільні. Беларускіе Вучыцельскіе Курсы ў Вільні, ладжэные Беларускім Т-вом пом. пац. ад вайны, аткрыюцца ізноў у першай палавіне месяца лютаго.

Курс будзе трываць 6 месяцоў паводлуг старой праграмы. Лекціі будуць чытацца вечэрам—ад 5 гадзіны.

Запісывацца трэба загадзя ў Беларускім Камітэці, Віленская 33, кв. 1, што-дзень ад 2 да 3 гадз.

× **Абеды для дзяцей.** Прадукты на абеды для дзяцей — вучнёў беларускіх школ у Вільні местовы урад будзе выдаваць паводлуг установленых цэн ад 1 лютаго.

Абеды будуць у большай часьці школ варыць на мейсцу, — дзеля чаго Камітэт робіць адпаведные прыгатаўленьня, каб пры школах наладзіць свае страўні.

Гэты крок трэба шчыра вітаць, бо і для дзяцей і для Камітэту будзе шмат выгадней, калі за гарачай стравай ня прыйдзецца вадзіць дзяцей у публічные страўні. Былоб вельмі добра, каб усе школы перайшлі на гэты спосаб стравваньня дзяцей.

× **Сьмерць жыдоўскаго вучонаго.** Як пішэ „Лецтэ Найес", 24 студня памер пасьля цяжкай хваробы вядомы жыдоўскі вучоны, вядомы з досьледоў над вавілонскім талмудам, Дов Бэр Ратна, 64 гадоў.

× **„Ваенная друкарство".** Пад гэткім названьнем „на Выстаўцы Работных Дамоў аткрыта наладжэная „10 Armee Zeitung" выстаўка друкарства.

× **У местовых крамах** ёсць дзеля прадажы на хлебовые карты гарох і фасоля.

× **Для тутэйшай электрычнай станціі** патрэбен тутэйшы інжэнер з дыплёмам, сі електротэхнік с практыкай. Заяўляцца трэба ад 11 да 1 у Stadtbaurat'a.

× **Апавешчэньне аб прышчэпцы оспы.** Жыхары Плытніцкай, Вузкай, Панскай, Магазыновай, Лукішскай, Мэчэтнай, Магомэтанскай, Монтвіллоўскай і Турэмнай вуліц, а таксама Монтвіллоўскаго і Турэмнаго завулкоў прызываюцца гэтым ураз-жэ даць прышчапіць сабе оспу.

Першы пункт для прышчэпкі: Фэльчэрская Школа пры бальніцы сьв. Якуба — кожын дзень апрыч нядзель ад 10 г. раніцай да 3 г. паабедзі.

Другі пункт: б. местовы лазарэт, Острабрамская 10, — кожын дзень апрыч панядзелкоў ад 12 да 1/2 2 г.

Вільна, 26 студня 1917 г.

Der Deutsche Stadthauptmann
Pohl.

× **Курс рубля:** офіцыальны — 2 м. 00 фэн. за рубель; у банках пры прадажы — 2 м. 18 ф., пры куплі—2 м. 22 ф.

Пазычковая каса бярэ 6%.

× **Тэмпэратура.** Найвышэйшая і найніжэйшая тэмпэратура за апошніе дні была:

	найвыш.	найніж.
за дзень з 25 на 26	— 5°	— 8°
„ з 26 на 27	— 6°	—14°
„ з 27 на 28	— 7,3°	—12°

Апавешчэньне.

Нямецкая Выстаўка Штукарства ў Вільні (творы Каралевецкіх мастакоў) пад пратэктаратам Яго Экспэленціі Пана Генэрала-Обэрста фон Эйхгорн'а, Глаўнакамандуючаго Армейскай Групай, аткрываецца пры запрошэных госьцях у доме Залкінда № 67, пры Вялікай вуліцы, у чэцьвер, 1 лютаго 1917 году, а 12 гадз. ў палудні.

Для публікі ўход на выстаўку аткрываецца ў чэцьвер, 1 лютаго, а 3 гадз. паабедзі.

Выстаўка адчынена кожын дзень ад 10 гадз. раніцай да 8 гадз. вечара.

Білеты на ўход можна купляць у касе Выстаўкі.

Пастаянные білеты — 2 маркі.
Аднорязовые білеты на ўход
для сталых — 0,50 м.
для ваенных, ад фэльдфэбэля ўніз — 0,25 м.
для вучнёў і дзяцей менш, як 14 гадоў — 0,20 м.

Для школ і таварыств даецца пазваленьне адведаць выстаўку па асобным цэнам пасьля заяўкі загадзя ў канцэлярыі Выстаўкі пры Вялікай вул. № 67.

Вільна 26 студня 1917 г.

Der Deutsche Stadhauptmann
Pohl.

Апавешчэньне

Паліцэйскі загад з 25 студня 1917 г., апавешчэны ў № 25 „Wilnaer Ze..." з 26 студня 1917 г., замяняецца ніжэйпісаным паліцэйскім загадам:

На моцы загаду Начальніка Упраўленьня Вільні з 2. III. 1916 („V. B'." 1916 г., стр. 90, № 51) і загада з 8 лістапада 1916 г. (урадовы дадатак да № 4 „Wilnaer Zeitung"), для местоваго павету Вільні загадываецца:

Гаспадарскі Камітэт (Wirtschaftsausschuss) адзін толькі мае права скупляць рагатую скаціну, авец і сьвіней нават і п р о ц і волі гаспадароў. Гаспадары скаціны п а в і н н ы прадаваць Wirtschaftsausschuss'у за устаноўленую найвышэйшую цэну сваю скаціну, якую Wirtschaftsausschuss захочэ купіць.

За нарушэньня гэтаго караціmуць паводлуг §§ 138 і далейшых расейскаго статуту аб карах 1903 году.

§ 4 вышэй паменёнаго загада, каторы дапускаў прадажу рагатай скаціны і авец м і ж с у с е д з я м і, 20. I. 1917 скасован Этаппнай Інспэкціей 10.

Stadthauptmann на просьбу можэ, як выключэньне, даваць пазваленьне на пісьме і на іншую прадажу рагатай скаціны, авец і сьвіней.

Вільна, 27 студня 1917 г.

Der Deutsche Stadthauptmann.
Polizeiverwaltung.
Pohl.

З усяго Краю.

Пераное упраўленьня Обэр Ост.

БЕЛАСТОК (ад нашаго карэсп.) Ад 25 студня тут знаходзіцца упраўленьне Обэр Ост, якое перш было ў Коўні. А разам с тым места незвычайна ажывілося с прычыны наплыву массы новых людзей.

Для Коўны, а разам с тым для літоўскай часьці нашаго Краю пераное Обэр Ост — гэта утрата. Нідзе жыцьцё не кіпіць гэтак шпарка, як у цэнтры упраўленьня. І з гэтай прычыны трэба спадзевацца шыбкаго развіцьця ў Бэластоку і беларускаго жыцьця.

Грунт дзеля гэтаго тут добры: беларускую мову пачуеш на кожным кроку, а ў тарговые дні, калі з'еджаюцца з акалічных вёсак селяне, беларуская мова ўсюды пануе. Дый апошніе спісы насяленьня паводлуг нацыональнасьці ясна паказалі, які сільны ў Беластоку і ваколіцах беларускі элемэнт.

У недалёкім суседзтві ад Беластоку ўжо заложэна адна кузьня беларускай культурнай работы: гэта—вучыцельская сэмінарыя у Сьвіслочы, дзе некалькі энэргічных, цьвёрдых беларускіх працаўнікоў робяць вялікую, цэнную работу, узгадовываючы сьведомых беларускіх культурных работнікоў. Трэба думаць, што і ў Беластоку работа беларусоў скора закіпіць.

Падрад на сплаў плытоў.

БЕЛАСТОК. Аддаецца з ліцытаціі падрад на сплаў плытоў па Нарэву і Бугу ў Нямеччыну. Заявы трэба падаваць да 20 лютаго —асобне дзеля сплаву па Нарэву і па Бугу — ў лясное упраўленьне („Forstverwaltung"), у Беластоку, Фэльдпост 162.

Прадажа газы, сена і аўса.

БЕЛАСТОК. Атрымліваць газу ад таргоўцоў, каторым Stadthauptmann даў пазваленьне на таргоўлю, могуць паводлуг карт на газу толькі асобы, ў каторых німа электрычнаго сьветла. Таргоўцы павінны дзеля кантролю аддаваць у Граданачальство кожын месяц сабраные карты на газу.

Асобам, каторые дзержаць у горадзі каней і кароў, з Граданачальства выдаюць сено і авёс.

Павязкі для нямецкіх падданых.

БЕЛАСТОК. Нямецкіе падданые, якіе пражываюць у Беластоку, павінны насіць на рукаве павязку нямецкіх нацыональных колероў — чорнаго, белаго і чырвонаго.

Д-р Заммэнгофф—беласточанін.

БЕЛАСТОК. Д-р Заммэнгофф, каторы выдумаў вядомую сусьветную мову Эспэранто, родам з Беластоку. Ен жыве ў Варшаве.

Год жыцьця.

ГРОДНЯ. Гэтымі днямі тарговая камісія, каторая мае на мэці ажыўленьне торговаго і прамысловаго руху у Гродні і ваколіцах, сьвяткуе год свайго жыцьця.

Сьмерць за падпал.

ДОМІНЕЦКІ (Ваўкавыск. пав.). За падпал тут 5 гумен, у тым ліку 3 з урадзяаем, беластоцкі акружны суд засудзіў селяніна Марка Данцевіча на сьмерць цераз павешаньне.

Арэнда вод.

КОШЭДАРЫ. 1 лютаго з 9 гадз. раніцай у паветовым урадзе ў Кошэдарах будуць аддаваць у арэнду права лавіць рыбу ў межах павету, каторы дзеля гэтаго пабіт на 21 участак.

За спробу душэгубства.

ОЛЬКЕНІКІ. За спробу забіць сакерай селянку Стэфанію Акеленіс, каторай было зроблено 15 ран, найміт Язэп Сабалеўскі, 19 гадоў, засуджан віленскім акружным судом на 6 гадоў у папраўчую турму.

Канакрадзтво.

БАЛКОВІЧЫ, Радунск. пав. Тут і ў вёсцы Бальшышкі было некольки прыпадкоў крадзежы каней. Аб зладзеях нічога невядома.

Карта нацыональнасьцей нашаго Краю.

КОУНА. Як грамадзянство ў нашым Краю цікавіцца нацыональнымі справамі, відаць с таго, што карта нацыональнасьцей нашаго Краю, аб якой у сваім часе пісалося, выходзіць у другім выданьні. Цэна—старая: 10 марак.

Машэнствы з мясам.

СУВАЛКІ. Тут выкрылі штукі, якіе рабілі мясьнікі: яны зачынялі свае крамы, кажучы, што мяса ўжо німа, а пасьля прадавалі тое мясо цішком — дома за нячутые цэны.

Разстрэл ваенна-палонных.

СЭЙНЫ. Палевы суд у Сэйнах 15 студня засудзіў на разстрэл двох расейскіх палонных, каторые ў цывільнай апратцы, маючы пры сабе аружжэ, укрываліся ў вёсках. Прыгавор споўнен.

Трайная кара сьмерці.

ЛІБАВА. Столяр Фрыц Лінэс, каваль Ян Скудровскі і нейкі Янсон за душэгубствы і грабежствы, учыненые у апошнае паўгоду, тройчы засуджэны на кару сьмерці, на 15 гадоў папраўчаго дому і пазбаўленьне усіх грамадзкіх правоў.

ВЕСТКІ З РАСЕІ.

Урад і Дума.

ШТОКГОЛЬМ. Маршалка Думы, Родзянко, цар запрасіў у глаўную кватэру. «Рэч» кажэ, што гэта не мае нічога супольнаго са справай склікагьня Думы. Справа ідзе аб тое, каб нанова завязаць спыніўшыеся зносіны між правіцельствам і народным прэдстаўніцтвам, бо ад Думы будуць жадаць новых крэдытоў.

Трывожные весткі.

ШТОКГОЛЬМ. Паводлуг шведзкіх газэт, ходзяць самые дзікіе чуткі аб разрухах і пакушэньнях у Расеі і Фінляндіі. Тэлеграфные і тэлефонные зносіны Пецярбурга з заграгічнымі сталіцамі — вельмі цяжкіе.

Кажуць, што правіцельство дамагаецца, каб Родзянко пакінуў мейсцо маршалка Думы.

Дыктатура.

ШТОКГОЛЬМ. Некольки дзён таму назад у Шведзкіх газэтах з'явіліся чуткі аб назначэньні ў Расеі дыктатара. Гэтые чуткі цяпер апраўдываюцца весткамі расейскіх газэт. «Рэч» даведалася, што в. кн. Мікалай Мікалаевіч прыехаў у Пецярбург, каб прыступіць да спаўненьня чыннасьцей дыктатара, загаданых яму царом. Цар надалей будзе астаецца глаўнакамандуючым усіх ваенных сіл, а вядзеньне спраў упраўленьня даручыць аднаму з найболей цьвёрдых людзей, за якога лічаць Мікалая Мікалаевіча. Вестка гэта вызвала ў Расеі сільнае уражэньне.

Недавер'е ў Пэрсіі.

ТЭГЭРАН (В.Т.Б.). Расейскі паперовы рубель упаў да 20 шагі. Ніхто ня хочэ прынімаць расейскіх грошы, ня веручы трываласьці ўнутрэнаго палажэньня ў Расеі.

Самагубство Брусілова.

ШТОКГОЛЬМ. «Afton Bladet» даведываецца з Гэльсінгфорса аб упорных чутках, што генэрал Брусілов нідаўна, вярнуўшыся з глаўнай кватэры, застрэліўся.

Ізноў Куропаткін?

ШТОКГОЛЬМ. Генэрала Куропаткіна, каторага гэтак нідаўна скінулі с каманды палудзеннаго заходнім фронтам і паслалі ў Туркестан, неўспадзеўкі вызвалі у глаўную царскую кватэру, дзе ён і пражывае.

«Бірж. Вед.», каторые маюць блізкіе зносіны з ваенным міністэрствам, пішуць, што Куропаткіна маняцца назначыць начальнікам адной арміі на расейскім заходнім фронці.

Абарона Сэрэта.

БЭРН. «Бунд» даносіць с Пецярбурга, што за апошніе тыдні на адрэзак Галяц—Рэні прыбыло ад 8 да 10 расейскіх дывізій, каб забяспечыць фронт на Сэрэце ад далейшых удароў.

Назначэньне Сазонова.

ПЕЦЯРБУРГ. П.Т.А. даносіць офіцыяльна, што Сазонов назначэн паслом у Лондоні.

Падарожа Братіану.

ЛУГАНО. «Corr. dell'a Sera» даносіць, што Братіану паехаў у Пецярбург. Мэта яго падарожа—угода аб дастаўцы ваенных матэр'ялоў і пэрастройцы румынскай арміі. Апрыч таго, Братіану мае быць на нарадах саюзьнікоў аб палажэньні Румыніі.

Новые чыгункі.

ШТОКГОЛЬМ. С Пецярбурга даносяць, што расейскае міністэрство фінансоў разгледае праект расейскіх і амэрыканскіх фінансістоў збудаваць іх коштам некольки чыгунак с тым, што эксплёатацыя іх за перлые 9 гадоў будзе прыватная, а пасьля чыгункі пэройдуць да казны. Намечэны чыгункі: Масква—Дон, Паўночны Каўказ—Тыфліс.

З усяго сьвету.

Флаг Папежа на моры.

КОЛОНІЯ. Параход, каторы павязе пасла Папежа, Лаўрі, ў Пару, паплыве пад флагам Папежа. Гэта будзе прaява папескаго сувэрэнітэту.

ТЭЛЕГРАМЫ.

Нямецкіе апавешчэньня:

26.I. Заходні тэатр:

Фронт нямецкаго Насьледніка: На заходнім беразі Маасу з энэргічнай паддзержкай артылерыі, сапёроў і мінамётоў нашы войскі штурмавалі на шырыні 1600 мэтроў французскіе пазыціі на вяршыне «304». У штыкавой бітве ворагі мелі цяжкіе крывавые страты, ды утрацілі палоннымі 500 салдатоў з 12 афіцэрамі і 10 кулемётоў. Начные контратакі французоў не дайшлі удачы.

Усходні тэатр.

Фронт Леопольда Баварскаго: Бітвы на Аа і ўчора закончыліся здабыцьцем далейшых расейскіх пазыцый. На ўсходнім беразі адбіты сільные расейскіе контратакі. Узяты 500 палонных.

Фронт эрц-гэрцога Іозэфа: У даліне Касіну адбіты атакі некольких румынскіх рот.

Фронт фэльдмаршалка Макензэна: Нічога новаго.

Фронт Макензэна: На склоні гор Моглена баўгарскіе войскі адбілі сэрбскіе атакі.

27.I. Заходні тэатр.

Фронт Альбрэхта Вюртэмбэрскаго: Пры Діксмойдэн узята ў палон бэльгійская варта з 10 душ.

Фронт Рупрэхта Баварскаго: На поўдні ад канала Лябассэ адбіты англіцкіе атрады. На палудзенным заходзі ад Шілі адбіты французы.

Фронт нямецкаго Насьледніка: Пасьля неудачнай начной французскай атакі, раніцай быў новы штурм, каторы зломлен с крывавымі стратамі.

Усходні тэатр:

Фронт Леопольда Баварскаго: На ўсходзі ад Аа новые сілы расейцоў, прысланые на падмогу, не здалелі адваяваць назад здабытых намі за апошніе дні пазыцый.

Фронт эрц-гэрцога Іозэфа: Між далінамі Касіну і Путна нямецкіе і аўстрыяцкіе атрады ўзялі 100 палонных.

На *Фронці Макензэна* і на *Македонскім фронці*—без ніякіх прыпадкоў.

28.I. Заходні тэатр:

Фронт Рупрэхта Баварскаго: Пасьля сільнай падгатоўкі агнём англіцкім атрадам удалося ўварвацца на невялікую частку нашай пярэдняй пазыціі на палудзенным заходзі ад ле Транслюа, на поўначы ад Соммы.

У другіх арміях, ня лічучы часоваго узмацаваньня агня, было спакойна.

Усходні тэатр:

Фронт Леопольда Баварскаго: На Аа была вострая артылерыйская бітва. Наабапол Аа штурмы расейцоў адбіты з вялікімі у іх стратамі.

Фронт эрц-гэрцога Іозэфа: На адрэзку Мэстэканэсті, пры Залатой Быстрыцы, с прычыны пэраважываючаго націску расейцоў, заштчыта была адсунута бліжэй да ўсходняго берагу.

Фронт фэльдмаршалка Макензэна Без выдатных прыпадкоў.

Аўстрыяцкае апавешчэньне.

ВЕНА 27.I. Усходні тэатр: (гл. нямецк. апав.).

Італьянскі тэатр: Артылерыйскі агонь і работа лятуноў у ваколіцах Горца былі больш энэргічные, чым звычайна. У ваколіцах возера Добэрдо агонь артылерыі трываў, не слабеючы, да поўначы.

Напасьць на узбярэжжэ Англіі.

БЭРЛІН. У начы з 25 на 26 студня нямецкіе марскіе сілы зрабілі напасьць на англіцкае узбярэжжэ і абстрэлялі умацованы пункт Саўсвольт. Пасьля гэтаго вярнуліся назад, не сустрэціўшы сіл ворагоў.

Падводная вайна.

БЭРЛІН. (В.Т.Б.). Адна наша падводная лодка 25 студня затапіла болей-меней у 250 марскіх мілях на ўсходзі ад Мальты ваенны транспорт ворагоў з войскам; ён затануў у 10 мінут.

Блокада Даніі і Голандіі.

КОПЭНГАГА. У англіцкай ноці апавешчэна блокада нямецкаго узбярэжжа ў Паўночным моры, абнімаючы і часць узбярэжжа Даніі і Голандіі.

«Вайна да канца!»

БРЫСТОЛЬ. Міністэр Бонар Лоў ад імі англіцкаго міністэрства даў у сваей прамове атказ на пісьмо Вільсона, гаворучы між іншым:

„Нямеччына зрабіла нам таксванае мірнае прэдлажэньне. Яна атрымала на гэта ад саюзьнікоў ядыны магчымы атказ“.

Далей Бонар Лоў пералічыў абвіненьня проці Нямеччыны: нарушэньне умоў і іншые праступкі ў вядзеньні вайны і проці жыхароў занятых зямель. „Усё гэта было зроблено, і ніхто з нэутральных ня меў сілы стрымаць гэтаго. Нямецкае мірнае прэдлажэньне мы аткінулі толькі затым, што мір цяпер—гэта била-бы пабеда немцоў, ды ён даў-бы немцам магчымасць ізноў прыгатавацца і, выбраўшы выгодны для іх час, ізноў увясьці сьвет у страшэнствы, якіе мы цяпер перажываем.“

За мір.

ПАРЫЖ. (Гавас). Партія злучэных соцыалістоў, зложаная з 80 членоў, прыняла сягоньня рэзолюцію, з радасьцю вітаючы пісьмо Вільсона. Яна прызывае ваюючые народы зрабіць націск на свае правіцельствы, каб яны ўчынілі сумленна спробу, якую прэдлажыў Вільсон.

Грэцкая трагедія.

АФІНЫ. (Рэўтэр). Грэцкі урад падаў паслам саюзьнікоў ноту, ў каторай, згодне з жаданьнямі ультіматума, выказывае свой жаль і формальна перэпрашае за сумные здарэньня 1 сьнежня 1916 году.

Урочыстая цэрэмонія прывітаньня знамён саюзьнікоў адбудзецца перад Цаппэйёнам. Каралеўскім прыказам, згодне з жаданьнем саюзьнікоў, зменен начальнік I корпуса генэрал Калярыс.

ЛОНДОН. (В.Т.Б.). «Daily Chron.» даносіць з Афін, што саюзьнікі пастанавілі ўзяць грэцкіе таргове параходы дзеля сваіх таргових патрэб.

ЛЮГАНО. «Corr. della Sera» піша: „Трываючая ўжо 50 дзён блокада—вельмі цяжкая для Грэціі. Спажыўные прадукты ўсе вышлі“.

Францускіе афіцэры с сэнэгальскімі нэграмі прыбилі ў Афіны.

За волю Індіі.

КОПЭНГАГА. Спаўніцельный камітэт індускай нацыональнай партіі звярнуўся да прэзыдэнта Вільсона с тэлеграмай, дзякуючы за яго пісьмо, ў якой далей гаворыца:

„Мы сур'ёзна спадзеваемся, што ваш магутны голас паднімецца за пакутуючый народ Індіі. Мы заяўляем, што без свабоднай і незалежнай Індіі ня можа быць доўгаго сусьветнаго міру“.

Спіс ваенна-палонных з нашаго краю.

З Вільні і Віленскай губэрні.

Табор для ваенна-палонных Puchheim.

IV Батальён.

Эйгін Абрам, Друя.
Злотаябко Айзік, Быстрыца.

I Батальён.

Гладкоў Якоў, Гай.
Якімовіч Юльян, Нарожні.
Красноўскі Вінцэнты, Жоклі.
Маліноўскі Кузьма, Вільня.
Мішасёнак Іван, Шыркі.
Місун Сьцепан, Субоч.
Масэйко Іван, Кадучкі.
Пішчык Павал, Цвібуты.
Плотнікоў Сяргей, Ново-Вілейск.
Пунька Сьцепан, Пецешына.
Прончак Іван, Вільня.
Пашкевіч Владзімір, „
Урбановіч Язэп, „

II Батальён.

Харэвіч Ігнат, Міхайлоўскае.
Капцюк Бэнэдыкт, Бароўшы.
Куцкевіч Ануфры, Озаркі.
Мізэр Антон, Вільня.

III Батальён.

Антоноў Ермолай, Голешышкі.
Апаценак Тэофон, Латыголь.
Багдановіч Пётр, Кароўшыно.
Гіль Іван, Падбродзе.
Яблонскі Александар, Вялікае Сяло
Януковіч Віктор, Кабелі.
Юхневіч Сьцепан, Шары.
Колас Александар, М. Гнедукоўск.
Місюкевіч Захар, Ніродзі.
Міцкевіч Язэп, Лэпках
Петроўскі Павал, Рудовічы.
Шынгель Юстын, Навасельле
Шугар Пётр, Стэроль-Гродзішко.
Танковіч Васіль, Barkзакчаўк.
Чэрняўскі Антон, Трыдзерны.

IV Батальён.

Бэрняковіч Мікалай, Дзерэвянная.
Будзько Аляксей, Юзафово.
Харытонов Александар, Горшаны.
Хвалько Ілья, Навасёлкі.
Дайноўскі Іван, Дорхі.
Давідовіч Павал, Каменка.
Грузд Андрэй, Паддубнік.
Карнай Язэп, Цьвербуды.
Каспэровіч Васіль, Домбровічы.
Кісіль Васіль, Татаршыно.
Казэрскі Пётр, Ягодзень.
Кавалевіч Антон, Ліпкі.
Кайрэцкі Іван, „
Крэн Аляксей, Казлы.
Крывец Іван, Ліпкі.
Кулаковіч Іван, Агаўка.
Квятковіч Аляксей, Курыкс.
Лазар Піліп, Юстыноўка.
Ліхародоў Язэп, Солейкі.
Мацкевіч Аляксей, Баравой.
Несьцеровіч Якаў, Осташково.
Пучкоўскій Мікалай, Вільня.
Рэвяка Тодар, Карповічы.
Розум Пётр, Дуброва.
Рубніковіч Вінцэнты, Кавалі.
Санкевіч Раман, Татары.
Завадзкі Тодар, Волковышкі.
„ „ Аборы.
Скурко Лаўрэнт, Полокоўчына.
Сьцепаноў Васіль, Краснае.
Зубач Язэп, Скоры.
Шадурскі Александар, Клімено.
Шатроўскі Антон, Печнікі.
Шаменко Сьцепан, Застарышчэ.
Шэрнэль Сьцепан, Кітно.
Жоўнеровіч Александар, Мошычы.
Шунэйко Майсей, Бакшта.
Сушэвіч Павал, Ілья.
Шуплак Мікалай, Забёджэ.
Усьцімчук Васіль, Маладніца.

V. Батальён.

Бараўскі Ігнат, Мэйшагола.
Белевіч Альфонс, Вільня.
Бэрнатовіч Захвірын, Дубовічы.
Бэзуковіч Людвік, Ашмяна.
Борысэнко Іван, Лазово.
Будрынскі Казімір, Вандалішкі.
Будрук Язэп, Ганушышкі.
Бурачэўскі Ромуальд, Вільня.
Дэмэшкевіч Захарый, Комсіно.
Добрынскі Александар, Договрэшчына.
Домброўскі Адольф, Шыдабрі.
Фёдоровіч Грыгор, Крашыно.
Гайдамовіч Міхаіл, Вільня.
Грыб Антон, Талямі.
Грычалоўскі Міхаіл, Гедройці.
Ізосін Андрэй, Вільня.
Якубёнак Васіль, Шудаўцы.
Янкоўскі Альфонс, Пекуні.
Януш Ілья, Тарасоўка.
Ярош Казімір, Шудаўцы.
Ярошэвіч Ігнат, Панкраты.
Юзэфовіч Гэнрык, Вільня.
Кіслоўскі Станіслаў, Дыново.
Калесьнік Станіслаў, Кевкішкі.
Камароўскі Владыслаў, Пелёканцы
Косіловіч Іван, Дукіці.
Косінскі Пётр, Вільня.
Косілоўскі Казімір, Дайново.
Крыжаноўскі Мікалай, Дварцовая Сабада.
Лазовіч Іван, Мядаёл,
Лемешоў Іван, Нова-Сёлкі.
Ліпін Іван, Вільня.
Лушчык Ігнат, Луга.
Лучынскі Броніслаў, Горбацішкі.
Лукша Адам, Куцепята.
Малдіс. Язэп, Расолы.
Марцінкевіч Вінцэнты, Бігэрды.
Машут Якаў, Боркоўшчына.
Мацкевіч Станіслаў, Здарэньне.
Мядзьведзкі Язэп. Кунігішкі.
Ніконоў Павал, Перэлазы.
Парафіновіч Вінцэнты, Граўжуны.
Петровіч Эмэрык, Ківелі.
Поцюлян Язэп, Мал. Солечнікі.
Пражмут Іван, Мэлегяны.
Прытульскі Язэп, Раўніна.
Руткоўскі Каетан, Вільня.
Закрэўскі Александар, Загос.
Сауковіч Броніслаў, Сімонэлі.
Скшыцкі Язэп, Вільня.
Жаваронак Язэп, Скойдзішкі.
Шэміс Гэнрык, Гэрвяты.
Шкель Антон, Рагозін.
Станкевіч Іван. Шукічы.
Шчэрбіцкі Грыгор, Кулакі.
Зубрыцкі Андрэй, Дварышчэ.
Татоль Адольф, Пелюшкі.
Тышкевіч Вітольд, Мэйшагола.
Верэмей Андрэй, Рукойны.
Вершыцкі Міхаіл, Сябрин.
Вогіль Іван, Вільня.
Войчан Александар, Грогі.
Войцелевіч Юрый, Дэмті.
Волковіч Язэп, Віньдаюкі.
Волковіцкі Броніслаў, Язово.
Цэйко Іван, Кемелішкі.
Цырыноўскі Павал, Петрышкі.

Табор для ваенна-палонных Minden.

Фінкельштэйн Арон, Цушкі.
Гэрцэнштэйн Ізраэль, Вільня.
Левіт Гамбіль, „
Сэгаль Зальман, Дына.
Амашкевіч Хлор, Вільня.

(Далей будзе).

Друкавана у друкарні М. Кухты. Выдавецтво «Гоман». Редактар В. Ластоўскі.